

7. Дыван «накладаны». 1960-я гг. Ільняныя і шарсцяныя ніткі; аднабаковы перабор; в. Заазер’е Лепельскага р-на Віцебскай вобл. Майстар Рагавенка Ніна Кірылаўна, 1926 г. н.



8. Посцілка. 1950-я гг. Ільняныя і шарсцяныя ніткі; чатырохнітовае ткацтва, аднабаковы перабор; в. Ліпкі Лепельскага р-на Віцебскай вобл. Майстар Рыжова Ганна Сямёнаўна, 1904 г. н.



**С. В. Мяньчэня**

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ДЗЕЙНАСЦІ ЛЕПЕЛЬСКАГА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА ПАПЯЧЫЦЕЛЬСТВА АБ НАРОДНАЙ ЦВЯРОЗАСЦІ

З 1 ліпеня 1897 года ў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях у выніку правядзення рэформы па ўвядзенню дзяржаўнай «віннай» манаполіі былі створаны камітэты папячыцельства аб народнай цвярозасці [7, с. 14]. Дзяржава атрымала выключнае права на продаж алкагольных напояў і разам з гэтым абвяшчала аб пачатку кампаніі па барацьбе з п’янствам. Выканаўцамі гэтай палітыкі на месцах павінны былі стаць папячыцельствы, аднак мэтай іх было не канчатковае скараненне ўжывання спіртных напояў, а адмежаванне насельніцтва ад празмернага спажывання алкаголя [4, арк. 3]. Камітэты ствараліся на губернскім узроўні пад кіраўніцтвам губернатара і на павятовым пад кіраўніцтвам мясцовага прадвадзіцеля дваранства. У склад камітэтаў уваходзілі прадстаўнікі фактычна ўсіх ведамстваў: царквы, сістэмы адукацыі і здравааховы, жандармерыі, суда і войска, чыноўнікі казённай, акцызнай і кантрольнай палаты. Гэта давала камітэтам значныя магчымасці, але з іншага боку пераўтварала іх у бюракратычныя арганізацыі, члены якіх, часцей за ўсё былі занятыя на асноўным месцы службы. Акрамя абавязковых членаў у склад камітэта ўваходзілі участковыя папячыцелі, якія ажыццяўлялі нагляд за пэўнай тэррыторыяй. Участковыя папячыцелі атрымлівалі запрашэнне ад камітэта толькі пасля рэкамендацыі паліцэйскіх органаў, якія па пастанове міністэрства фінансаў займаліся пошукам «лепшых людзей губерні» [4, арк. 3]. Яшчэ адной катэгорыяй былі члены-сарэўнавацелі, якія падцвярджалі сваю прыналежнасць да камітэта ці актыўнай працай, ці гадавым узносам у памеры 5 рублёў [1, с. 90].

Лепельскі павятовы камітэт папячыцельства аб народнай цвярозасці ўзначаліў прадвадзіцель дваранства адстаўны штабс-ротмістр Уладзімір Савіцкі [6, с. 216]. На сваёй структуры Лепельскі камітэт мала адрозніваўся ад іншых павятовых камітэтаў беларускіх губерняў. Першапачатковы энтузіазм даволі хутка прайшоў і пачынаючы з 1902 года колькасць членаў камітэта пастунова скарачалася. Так да 1906 года ў павеце пры колькасці насельніцтва 159 тысяч чалавек [6, с. 54] засталося толькі 4 папячыцеля і 15 членаў-сарэўнавацелей, з якіх актыўную дзейнасць праводзілі толькі 7 чалавек [2, арк. 8–9]. Удзел жанчын у працы камітэта быў нязначным і штучна абмежаваным. Статут папячыцельстваў не даваў прамога адказу на пытанне, ці могуць жанчыны быць папячыцелямі, што трактавалася як забарона. У 1906 годзе жанчын у складзе камітэта было толькі дзве [2, арк. 8–9]. Сацыяльны і саслоўны склад Лепельскага камітэта таксама быў дастактова тыповы. Тут пераважалі чыноўнікі, святары, настаўнікі і землеуладальнікі. Сяляне традыцыйна былі прадстаўлена рэдка, а ўвогуле адсутнасць мясцовых земстваў рабіла папячыцельства беларускіх губерній больш аморфнай структурай у параўнанні з уласна расійскімі землямі. Да асаблівасцяў асабовага складу камітэта трэба аднесці актыўную пазіцыю яўрэйскага насельніцтва, звычайна абыякавага да дзейнасці папячыцельстваў. Гэта тлумачылася нізкім узроўнем спажывання алкаголя сярод яўрэяў і традыцыяй утрымання яўрэямі корчмаў. «Вінная» манаполія выклікала змяншэнне колькасці корчмаў, што прывяло да банкрутсва многіх яўрэйскіх сямей. У Лепелі ж яўрэйская грамадскасць на чале з загадчыкам Лепельскага яўрэйскага вучылішча Мордухам Баруховічам актыўна ўключыліся ў працу папячыцельства [5, арк. 45].

Камітэты павінны былі ажыццяўляць нагляд за выкананнем правіл продажу алкаголя, весці культурна-асветніцкую дзейнасць і арганізоўваць цвярозы дасуг насельніцтва, адкрываць чайныя, народныя чытальні і бібліятэкі. Сродкі на гэтыя мерапрыемствы камітэты атрымлівалі з дзяржаўнага бюджэта, ад мерапрыемстваў і устаноў саміх папячыцельстваў, а менавіта даходы ад чайных, продажу кніг, народных чытанняў і гулянняў. Таксама папячыцельства павінна было атрымліваць даход у выглядзе штрафаў за парушэнне піцейнай манаполіі, калі такія выпадкі выяўляліся членамі-папячыцелямі [1, с. 90]. Аднак выйсці на самафінансаванне папячыцельства не здолелі і заставаліся залежнымі ад дзяржаўных датацый. Сярэдні памер іх складаў першапачаткова каля трох тысяч рублёў, але ў 1904 годзе ў сувязі з падзеямі руска-японскай вайны фінансаванне папячыцельстваў было скарочана, а ў 1910 годзе фінансаванне зноў скарацілі. Значная частка гэтай сумы камітэты накіроўвалі на арганізацыю справаводства. Так толькі аклад справаводца Лепельскага камітэта ў 1899 годзе склаў 400 рублёў, пры гэтым якасць яго працы была не высокай, а Віцебскі губернатар неаднаразова скардзіўся, што мясцовую карэспандэнцыю чытаць немагчыма [5, арк. 49].

Адкрыццё чайных, якія павінны былі адцягнуць мясцовае насельніцтва ад наведвання карчмы, з’явілася асноўным накірункам дзейнасці папячыцельстваў. Аднак, трэба адзначыць, што арганізацыя работы чайных у Лепельскім павеце, як і цэлым па Віцебскай губерні, была дастаткова слабой. Так да сярэдзіны 1899 года Лепельскі камітэт адкрыў 5 чайных у павеце: у Лепелі, Вушачах, Улле, Бешанковічах і вёсцы Копцевічы (сёння — Чашніцкі раён). Наведваць чайную мог кожны з мэтай адпачыць, абагрэцца, схавацца ад дажджу, пры гэтым плата з яго не ўзымалася, а персанал чайной не мог перашкодзіць гэтаму. Тут жа можна было бясплатна пачытаць газеты і часопісы («Віцебскія губернскія ведамасці», «Свет», «Деревня» і іншыя). Наведвальнікам прапаноўваліся чай, закускі, тытунь. Але частка наведвальнікаў нічога не купляла, а наведвала чайныя для чытання і сустрэч. Здараліся і выпадкі парушэння правапарадку. Пад час рэвізіі Копцевічскай чайной, была заўважана група падлеткаў, якія так заўзята гулялі ў карты, што прыезда камісіі нават не заўважылі [5, арк. 45].

Чайныя, нажаль, не карысталіся вялікай папулярнасцю сярод насельніцтва і ва ўмовах канкурэнцыі з шынкамі прыбыткаў прыносілі значна менш за затрачаныя сродкі. Вялікай праблемай была адсутнасць у камітэта сваіх памяшканняў, і калі Лепельская і Копцевічская чайныя размясціліся бязвыплатна, то за арэнду ў Чашніках камітэт плаціў 120 рублёў у год, а за Вушачскую чайную — 300 рублёў [5, арк. 2, 43]. Вялізная арэндная плата, якая ніяк не суадносілася з даходам стала галоўнай прычынай таго, што ў лістападзе 1899 года камітэт, пасля безпаспяховага пошуку больш таннага памяшкання, закрыў чайную ў Вушачах, негледзячы на пратэсты і скаргі мясцовых праваслаўных святароў [5, арк. 49]. Там, дзе арэнднай платы не было, чайныя працавалі больш эфектыўна. Для прыкладу, Лепельская чайная ў 1898 годзе дала 200 рублёў прыбытку, а ў 1899 — ужо 600 рублёў [5, арк. 43], але ў наступныя гады колькасць наведвальнікаў і даход чайной рэзка скараціліся.

Нерэнтабельнасць і малаэфектыўнасць чайных прымусіла Лепельскі камітэт у 1904 годзе прыняць рашэнне аб закрыцці ўсіх чайных і накіраванні грашовых сродкаў на стварэнне народных бібліятэк і чытальняў. Іншыя камітэты Віцебскай губерні ад чайных не адмаўляліся да 1912 года (Люцынскі і Рэжыцкі павет) [3, арк. 2].

У справе стварэння народных бібліятэк і чытальняў Лепельскі камітэт дасягнуў пэўных поспехаў. У 1906 годзе ў Віцебскай губерні налічвалася 109 бібліятэк і чытальняў з 26 478 абанентамі. Пры гэтым 9650 абанентаў былі чытачамі Лепельскага павета, а 8694 абанентаў — Гарадокскага, але калі ў Гарадокскім павеце налічвалася 34 чытальні, то ў Лепельскім усяго 5 [2, арк. 16–17]. У большасці ж паветаў выдача кніг на рукі ўвогуле не прадугледжвалася, а чытаць кнігі можна было толькі на месцы. Асноўную вагу чытачоў складала вучнёўская моладзь, а асаблівай папулярнасцю карысталася мастацкая літаратура.

Яшчэ адным важным накірункам культурна-асветніцкай дзейнасці камітэтаў папячыцельства аб народнай цвярозасці стала правядзенне народных чытанняў. Тэматыка чытанняў была даволі шырокай: антыалкагольная тэматыка, пытанні гігіены і здароўя, гісторыя і геаграфія, царкоўныя пытанні, праблемы сельскай гаспадаркі, мастацкія творы. Аднак на месцах усё залежыла ад якасцяў і ўзроўня адукаванасці лектара (у Лепельскім павеце гэта былі выключна мясцовыя настаўнікі і святары). Найбольшую цікавасць у насельніцтва выклікалі чытанні з «туманнымі карцінамі чароўнага ліхтара» (праэктара). Але колькасць такіх чытанняў абмяжоўвалася наяўнасцю «чароўнага ліхтара» і карцін да яго. Некаторыя гледачы наведвалі адну і тую ж лекцыю па некалькі разоў не столькі дзеля інфармацыя, колькі для відовішча. З цягам часу, калі карціны былі прагледжаны па некалькі разоў, а «чароўныя ліхтары» зламаліся, колькасць слухачоў значна знізілася, бо лекцыі без «туманных карцін» насельніцтва ўспрымала горш. Лепельскі камітэт у 1906 годзе арганізаваў 374 чытанні ў 43 населеных пунктах павета. Для параўнання, Віцебскі камітэт ахапіў толькі 9 населеных пунктаў, а Полацкі — 11. З 140 чытанняў на антыалкагольную тэматыку у Віцебскай губерні 48 былі арганізаваны ў Лепельскім павеце [2, арк. 18 адв. — 19].

Такім чынам, дзейнасць Лепельскага павятовага камітэта папячыцельства аб народнай цвярозасці была асноўным чынам накіравана на арганізацыю культурна-асветніцкай дзейнасці сярод насельніцтва з мэтай абмежавання спажывання алкаголя. Яна праявілася ў арганізацыі чайных, бібліятэк і чытальняў і правядзенні народных чытанняў. Аднак шэраг фактараў, такіх як недахоп фінансавання, недакладнасць заканадаўства і адсутнасць ініцыятывы з боку насельніцтва, значна паўлывалі на эфектыўнасць гэтай працы. Сярод асаблівасцяў працы Лепельскага камітэта можна вызначыць удзел яўрэйскага насельніцтва і адмова ад арганізацыі чайных, якія не маглі вырашыць тых задач, якія перад імі ставілі. Да таго ж трэба адзначыць, што даследванне дзейнасці Лепельскага папячыцельства аб народнай цвярозасці мае важнае значэнне ў вывучэнні гісторыі паўсядзённага жыцця насельніцтва ў канцы XIX — пачатку XX стст.

Крыніцы

1. Меньченя, С. В. Структура и деятельность Могилёвского губернского попечительства о народной трезвости (1897 –1903 гг.) // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук: сб. науч. статей Междунар. науч. — практ. конф., посвящённой 100-летию МГУ им. А. А. Кулешова. 18–19 апреля 2013 г., г. Могилёв; МГУ им. А. Кулешова. — Могилёв: МГУ им. А. А. Кулешова, 2013. — 460 с. (с. 90–91).
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Фонд 2555. — Воп. 1. сп. 238.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Фонд 2555. — Воп. 1. сп. 245.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Фонд 2709. — Воп. 1. сп. 2.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Фонд 2709. — Воп. 1. сп. 26.
6. Памятная книжка Витебской губернии на 1898 год. — Витебск, 1898. — 610 с.
7. Протько, Т. С. В борьбе за трезвость / Под ред. М. О. Бича. — Минск: Наука и техника, 1988. — 162 с.

**Г. Н. Яковлева**

## ПРОТОКОЛЫ ЛЕПЕЛЬСКОЙ УЕЗДНОЙ КОМИССИИ ПО ПАРТИЙНОЙ ЧИСТКЕ 1921 Г. КАК ИСТОРИЧЕСКИЙ ИСТОЧНИК

В условиях перехода к Новой экономической политике в 1921 г. была проведена первая генеральная чистка РКП(б). В ГАВт сохранилась значительная коллекция документов, характеризующих её проведение на губернском и уездном уровне. Среди прочих документов имеются протоколы заседаний Лепельской уездной комиссии по проверке партячеек местной уездной организации РКП(б). Анализ протоколов дает возможность оценить их исторический потенциал, изучить уездную парторганизацию с точки зрения социального происхождения, национального и гендерного состава рядовых членов РКП(б). Однако краткость протокольных записей не позволяет в полной мере реконструировать ту атмосферу, в которой проходила чистка. Автобиографий коммунистов, прилагавшихся к протоколам, а также материалов общего собрания партийцев города в коллекции документов ГАВт, к сожалению, нет.



Уездная комиссия, состоящая из Иткина, Краевского и Коцына, начала работу 16 августа 1921 г. На своем первом заседании она ознакомилась с инструктивными документами по проведению чистки и приняла ряд решений по её организации. Было решено объехать все волостные ячейки, обойти все учреждения города, созвать общие собрания беспартийных рабочих, красноармейцев и служащих, на которых принимались заявления на членов партии, проявивших себя не с лучшей стороны, как от партийных, так и от беспартийных. Предоставить в «тройку» материалы также должны были партийцы-руководители учреждений, где не было ячеек. Обязан был ознакомить комиссию с имеющимся компроматом на коммунистов и Уездный комитет партии. Кроме чистки волостных ячеек, Лепельской городской парторганизации, которая была небольшой, необходимо было проверить социальный состав, освободиться от «примазавшихся» к партии и среди членов РКП(б), состоявших на учете в ячейках нескольких воинских формирований, которые располагались на территории уезда, что усложняло работу комиссии.

Подготовка к чистке, состоявшая в сборе предварительных материалов, характеризовавших членов городской и волостных партийных ячеек, закончилась в начале сентября. 4 сентября состоялось первое заседание комиссии по проверке кандидатов и членов РКП(б) четырех волостей уезда. Из 37 человек, проходивших проверку, «тройкой» 5 было исключено, 3 — считалось выбывшими. 6, 7 и 11 сентября проходили